Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЖНІЎНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 148 (30028)

НОВЫЯ РЭКОРДЫ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ

ЧЫРВОНКА

ПРЫЗВАННЕ – ВЫРАБЛЯЦЬ ПАПЕРУ

ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КУПЧЭНЯ, начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС:

«Органы ўнутраных спраў гатовыя гарантаваць бяспеку падчас II Гульняў краін СНД. Мы вывучаем досвед і падзеі, якія адбываюцца ў іншых краінах, і ў абавязковым парадку ўносім карэктывы ў свае рашэнні па арганізацыі аховы грамадскага парадку. У ліпені на кожным аб'екце былі праведзены вучэнні і трэніроўкі па дзеяннях асабовага складу і іншых зацікаўленых па рэагаванні на розныя няштатныя і нестандартныя сітуацыі, у тым ліку тыя, якія адбываліся за межамі нашай краіны. Таму органы ўнутраных спраў гатовыя рэагаваць. У нас ёсць неабходныя сілы і сродкі, у тым ліку новыя сродкі для супрацьдзеяння тым ці іншым выклікам і пагрозам. У прыватнасці, процідзеяння беспілотным лятальным апаратам. Мы гатовыя да гэтага — усё неабходнае на сённяшні дзень ёсць».

Жніво-2023

ПРАЦАВАЦЬ ЗНАЧЫЦЬ ШЧЫРАВАЦЬ

На Гомельшчыне найбліжэйшымі днямі чакаюць чарговых герояў жніва — аграрыяў-тысячнікаў на ўборцы збожжа новага ўраджаю

Фота Ірыны СТЫЛЬНІКАЙ.

Старшы камбайнер Мікалай ДАРОШЧАНКА і яго памочнік Сяргей КАТЛЯРЭНКА з ААТ «Пераможнік» Брагінскага раёна.

Пакуль жа адзначаюць першы рэкорд ва ўборачнай у рэгіёне. Адразу тры экіпажы намалацілі тысячу тон збожжа: усе — у адным раёне і ў адной гаспадарцы. Запаветныя рубяжы ў канцы мінулага тыдня пакарыліся аграрыям сельгаспрадпрыемства «Калінінскі» Добрушскага раёна. Тысячнікамі жніва сталі Сяргей БЕЛАВУСАЎ, Аляксандр БЕЛАВУСАЎ, Пётр САМОЙЛЕНКА, Андрэй ВАРГАНАЎ, Мікалай ВАРГАНАЎ, Ілья ВАРГАНАЎ.

Акрамя таго, амаль тры дзясяткі механізатараў вобласці перасягнула паўтысячную мяжу ва ўборачным заліку. У Жлобінскім раёне больш за ўсё лідараў, якія першыя намалацілі і перавезлі 500 і больш тон збожжа новага ўраджаю, — а менавіта на рахунку аграрыяў ААТ «Бабоўскі».

Па тэмпах жніва з году ў год у лідарах у рэгіёне гаспадаркі Брагіншчыны. Сярод найлепшых гэтага раёна — камбайнеры сельгаспрадпрыемстваў «Брагінаграсэрвіс», «Пераможнік», «Малажынскі», «Чамярыскі», «Імя Жукава».

Па стану на 2 жніўня, аграрыі Гомельшчыны ўбралі збожжавыя культуры больш чым на 34 % плошчаў. Намалочана 198 тысяч тон. На сто працэнтаў завершана жніво азімага ячменю, які цяпер вырошчваюць у кожным раёне рэгіёна. На фінішнай прамой Гомельская вобласць — па ўборцы рапсу.

«Калі ёсць акно надвор'я, у поле павінны выходзіць усе камбайны», — акцэнтаваў увагу на апаратнай нарадзе **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО**. Па словах кіраўніка рэгіёна, неабходна актывізавацца, мабілізаваць усе рэсурсы для ўборкі ўраджаю ў тэрміны і без страт. Гаворка ідзе і аб тэхніцы, і аб людскіх рэсурсах.

СТАР. 3

КАРОТКА

- **«Белтэхагляд» у ліпені выдаў амаль 118 тысяч дазволаў на ўдзел у дарожным руху.**
- Падатковыя органы пачалі накіроўваць фізічным асобам паведамленні аб выплаце маёмасных падаткаў.
- **«Атлант» хутка выпусціць халадзільнік і пральную машыну, якімі можна кіраваць са смартфона.**

Спажывец

Сёлета пятая частка ўсіх купляў будзе ажыццяўляцца анлайн

Як вядома, электронная камерцыя працягвае развівацца і пашыраць свой уплыў на сусветную эканоміку. Паводле даных вядучых інфармацыйных кампаній, сёлета практычна 21 % сусветных рознічных купляў будзе здзяйсняцца анлайн. Гэта азначае, што брэнды і фірмы працягваюць нарошчваць сваю прысутнасць у анлайне і адаптавацца да новых патрэб і чаканняў пакупнікоў, а таксама выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі і інструменты для паляпшэння сваёй прысутнасці ў сеціве. Пра тое, якія трэнды на рынках e-commerce можна будзе ўбачыць у другім паўгоддзі, распавёў дырэктар кампаніі правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.

«Залатая» пляцоўка?

Гандлёвая пляцоўка (маркетплэйс) — гэта анлайн-платформа для продажу і куплі тавараў і паслуг праз інтэрнэт. Простымі словамі, там прадаўцы размяшчаюць свае тавары, пакупнікі выбіраюць найлепшыя варыянты па цэнах, характарыстыках і іншых параметрах. Самі маркетплэйсы нічога не прадаюць, іх задача — забяспечваць працоўванне тавараў. Дык вось, такія пляцоўкі з'яўляюцца адной з самых хуткарослых мадэляў бізнесу ў сферы анлайн-гандлю. Напрыклад, толькі ў расійскім сегменце інтэрнэту ў 2020 годзе аб'ём продажаў на маркетплэйсах склаў 721 мільярд рублёў, што на 108 % больш, чым у 2019-м. Па прагнозах экспертаў, да 2024-га іх доля ў анлайн-рытэйле можа дасягнуць 50 % ад усяго аб'ёму. Прыклады — Wildberries, Ozon, «Яндэкс Маркет» і іншыя.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

Сацыяльны вектар

«Гэтыя людзі павінны быць разам з намі»

Наталля КАЧАНАВА марыць стварыць у краіне IT-кампанію для людзей з аўтызмам

У Гомелі пад кіраўніцтвам старшыні верхняй палаты парламента Наталлі Качанавай прайшло пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Старшыня Савета Рэспублікі і кіраўнікі міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, культуры, а таксама спорту і турызму азнаёміліся з работай Гомельскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Яны на свае вочы ўбачылі, як праходзяць заняткі, пагутарылі з выхаванцамі і іх педагогамі, бацькамі, ацанілі ўмовы пражывання ва ўстанове.

Фота БелТА.

Гарадок, дзе сем'і могуць перадыхнуць

— Вялікі інвестыцыйны праект, але вельмі важны, — адзначыла Наталля Качанава ўжо пры першым знаёмстве з аснашчэннем памяшканняў дома-інтэрната.

Установа працуе 12-ы год. Вонкава яна нагадвае ўтульны катэджны гарадок. Размяшчаюцца тут пяць жылых карпусоў і асобны, адкрыты два гады таму, тэрапеўтычны рэабілітацыйны корпус. Сёння тут абслугоўваецца 140 чалавек: 65 — у групе дзённага знаходжання, 75 выхаванцаў знаходзяцца кругласутачна. Таксама ва ўстанове выхоўваюцца 22 дзіцяці, якія засталіся без апекі бацькоў.

— Мэта нашай работы — нармалізацыя жыцця сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеці з інваліднасцю, асабліва з цяжкімі шматлікімі парушэннямі ў развіцці. Працуем, каб кожная такая сям'я адчувала сябе абсалютна звычайнай, нармальнай, каб бацькі маглі раніцай устаць, прывесці дзіця на заняткі ў школу ці садок, гэта значыць да нас. Мы аказваем усе неабходныя сацыяльныя паслугі па псіхолага-педагагічнай карэкцыі, медыцынскай і сацыяльна-бытавой рэабілітацыі, прафарыентацыі і працоўнай тэрапіі. Прымаем дзяцей з чатырох гадоў і без абмежаванняў пасля паўналецця, — расказала аб рабоце свайго калектыву **дырэктар Гомельскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Галіна ДАЎГАПОЛАВА.**

Па яе словах, паслугай сацыяльнай перадышкі і кароткатэрміновага знаходжання ва ўстанове могуць скарыстацца жыхары ўсіх раёнаў Гомельскай вобласці. У групе дзённага знаходжання педагогі дома-інтэрната працуюць з дзецьмі і маладымі інвалідамі з Гомеля і Гомельскага раёна.

— Хтосьці дабіраецца да нас сам, кагосьці прывозяць бацькі. Акрамя таго, у нас ёсць свой спецыяльны транспарт з пад'ёмнікам і мы аказваем дапамогу ў падвозе, — дадала Галіна Даўгаполава. — З пачатку года паслугай сацыяльнай перадышкі ў нас скарысталася 25 сем'яў. Сёння па законе яна аказваецца на 56 дзён у год.

Наталля Качанава паназірала, як праходзяць заняткі па арт-тэрапіі, якія праходзяць для дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю. У класе, дзе на мальбертах замест аркушаў паперы — палотны белага шоўку, дзве дзяўчыны-выхаванкі выконвалі роспіс у тэхніцы «халодны батык». Займаецца гэтым кірункам творчасці з дзецьмі **інструктар па працоўнай тэрапіі Наталля ПУШКАРОВА.**

— Арт-тэрапіяй прапануем займацца ўсім нашым дзецям. У адных атрымліваецца лепш, хто не можа працаваць па шоўку, займаецца з паперай. Усю работу, акрамя нанясення контуру, дзеці выконваюць самі, — растлумачыла Наталля спецыфіку заняткаў.

Сюрпрызы ад прыхільнікаў

Старшыня Савета Рэспублікі перадала педагогу сертыфікат на набыццё мальберта. Выхаванцы, у сваю чаргу, папрасілі Наталлю Качанаву прыняць ад іх асаблівы сюрпрыз для яе — шалік з прынтам ручной работы.

— З дзяцінства люблю маляваць, — распавяла адна з выхаванак Юлія.

Дзяўчына прапанавала Наталлі Іванаўне, каб тая стала паміж ёй і яе сяброўкай, таксама Юліяй, і загадала жаданне. Дзяўчына ўпэўненая, што яно абавязкова збудзецца.

На занятках ва ўстанове, як патлумачылі педагогі, займаюцца дзеці, маладыя людзі з інваліднасцю, пакінутыя без апекі бацькоў, і тыя, якія жывуць у сваіх сем'ях.

— Тое, што дзеці тут разам, — гэта вельмі добра. Родныя дзеткі таксама камунікуюць адзін з адным. Нам трэба падумаць над такой формай работы з дзецьмі з інваліднасцю, якія засталіся без апекі бацькоў, — адзначыла Наталля Качанава.

На занятках у адных групах займаюцца і дзеці з рознымі парушэннямі псіхафізічнага здароўя, у тым ліку дзеці з расстройствамі аўтыстычнага спектра. Наталля Качанава высока ацаніла практыку заахвочвання гомельскіх школьнікаў-валанцёраў, якія прыязджаюць у дом-інтэрнат дапамагаць педагогам. Спікер запрасіла актыўных старшакласнікаў-валанцёраў у Савет Рэспублікі, каб бліжэй пазнаёміцца з работай парламентарыяў.

Вельмі кранальным момантам падчас наведвання стала тое, з якой адкрытасцю дзеці падзяліліся, што адразу пазналі Наталлю Іванаўну, бо запомнілі спікера па выступленнях на тэлебачанні.

— Мы вас толькі па тэлевізары бачылі, а сёння рады, што пазнаёміліся, — шчыра прывіталі Старшыню Савета Рэспублікі і выхаванцы Гомельскага цэнтра інклюзіўнай культуры.

Як распавяла кіраўнік цэнтра Ірына Цяпугіна, установа вызначаецца ў рэгіёне мноствам клубных аб'яднанняў па розных напрамках. Цэнтр сёння наведваюць 474 чалавекі.

Выхаванцы музычнай студыі «Ла-ла-лэнд» падрыхтавалі міні-канцэрт для гасцей. У гэтым гуртку заняткі праводзіць інвалід па зроку Дзмітрый Герашчанка. У выступленнях на сцэне ўдзельнічаюць дзеці з расстройствамі аўтыстычнага спектра.

Пасля выступлення дзяцей спікер пайменна падзякавала юным артыстам за іх творчасць. Яна звярнула ўвагу, што асаблівасць цэнтра інклюзіўнай культуры якраз у тым, каб вучыць дзяцей у тым ліку выступаць на вялікай сцэне для шырокай публікі.

«Часам чалавек губляецца...»

— Тое, што мы ўбачылі, мне спадабалася. І тое, што робіцца ў Гомелі і ў Гомельскай вобласці па рабоце з дзецьмі, па інклюзіўнай адукацыі, трэба ўзяць за аснову, якую мы павінны развіваць у іншых рэгіёнах, — падкрэсліла Наталля Качанава на пасяджэнні кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Сустрэча прайшла ў Гомельскім абласным грамадска-культурным цэнтры. У ёй узялі ўдзел члены Савета Рэспублікі, кіраўнікі міністэрстваў, устаноў адукацыі, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, урачы, прадстаўнікі грамадскасці, навуковай супольнасці, законныя прадстаўнікі і бацькі дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

Як звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі, кансультатыўны савет быў створаны зыходзячы з таго, што ў верхнюю палату парламента звярталіся людзі, якія выхоўваюць дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра, СДУГ, яны закранулі праблемы рэабілітацыі дзетак, далейшай іх сацыялізацыі, навучання.

— У нас у краіне выбудавана даволі зладжаная сістэма, якая вызначана заканадаўча, пастановамі міністэрстваў. Мы ўбачылі, што робім усё правільна, але часам чалавек губляецца ў сітуацыі і не ведае, дзе яму знайсці дапамогу, куды яму са сваёй праблемай звярнуцца, — нагадала парламентарый. — Гэтыя людзі павінны быць разам з намі. Яны такія ж, як мы. Толькі іх жыццё склалася трохі інакш. І мы павінны рабіць усё, як правільна прапісана ў нас у законах, і тое, аб чым нам заўсёды гаворыць наш Прэзідэнт.

Наталля Качанава падзялілася амбіцыйным праектам, які цяжка пераацаніць для падтрымкі людзей з расстройствамі аўтыстычнага спектра:

— Мая мара — стварыць IT-кампанію для людзей з аўтызмам у Беларусі.

Яна заўважыла, што IT-сфера не патрабуе ўмення шмат кантактаваць з людзьмі, што праблематычна для тых, хто мае падобныя расстройствы.

— Людзей з такімі захворваннямі неабходна падтрымліваць і дапамагаць ім ва ўсіх сферах — пры гэтым па прынцыпе «роўны — роўнаму». Мы павінны зрабіць усё, каб дапамагчы любому чалавеку — у ахове здароўя, адукацыі, культуры, іншых сферах. Няма невырашальных праблем, — перакананая Наталля Качанава.

Парламентарый таксама падкрэсліла, што на падобныя сустрэчы ў рэгіёнах абавязкова варта запрашаць бацькоў, сем'і, якія аказаліся ў падобных сітуацыях. Важна разам абмяркоўваць, што яшчэ трэба зрабіць у вырашэнні сацыяльна важнай задачы.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Па сутнасці

З адкрытым сэрцам

За гульнямі дзяцей, асабліва на свежым паветры, назіраць прыемна. Гэта вельмі добрая прыкмета часу. Радасна, калі дзеці забаўляюцца, а не хаваюцца ад бамбёжак. Бамбёжкі — гэта ўжо гульні дарослых у геапалітыку. У «дэмакратыю». Менавіта хлусліва «гуляюць». Бо нават спартыўныя арэны скінулі з алімпу чалавечнасці. У старажытнасці падчас алімпійскіх гульняў спынялі войны. Памятаеце: «О спорт, ты — мір!». У сэнсе прасторы — свет, ну і становішча, вядома. А сёння сучасныя ўладары заходняга «мэйнстрыму» спартыўныя пляцоўкі ператварылі ў палі баёў.

Функцыянеры, з кім ваюеце? Са спартсменамі? Выцерлі ногі аб мары людзей, якія ўсё свядомае жыццё чакалі тых стартаў, усё сваё жыццё падпарадкоўвалі інтарэсам спаборніцтваў. І тут такое. Не па-людску!

Функцыянеры, з кім ваюеце? Са славянамі? А мо яны проста пабойваюцца нашых спартсменаў і іх дасягненняў? Так дрыжаць, што нават забаранілі наш сцяг. Як бы яны ні стараліся — ён заўжды на вышыні. І чаму ўмоўныя тры працэнты заходняга свету дыктуюць сваю волю сусветнай супольнасці?

Такое ўражанне, што пра «сад і джунглі» сказаў Барэль, а думаюць так усе чыноўнікі міжнародных інстытутаў — ад АБСЕ да МАК. Паводзяць сябе, як акупанты — захапілі ў палон міжнародныя трыбуны і з іх лямантуюць, выстаўляюць умовы ўсяму чалавецтву.

Функцыянеры, з кім ваюеце? З думкай, з сумленнем, са здаровым сэнсам? Дарэмна намагаецеся схаваць ад міжнароднай супольнасці дзяржаўны сцяг нашай краіны. Ён ужо — сцяг перамогі. Лунае па-над рэчаіснасцю згубленага і загубленага Захаду. Бо толькі страчаная Еўропа можа налажыць санкцыі на відовішчныя спаборніцтвы, ваяваць супраць спартыўнага духу. Адбіраць у гледачоў і балельшчыкаў свята, незабыўныя ўражанні і прыемныя моманты.

Беларусь дэманструе, што такое Еўропа. Па-беларуску мы гэты выклік прынялі. І адказваем. Разважліва. Мы — бязвіз. Яны — жалезную заслону. Дзясяткі гадоў запар крытыкуючы Берлінскую сцяну, такія ж муры яны ўзвялі ў сэрцы самага рэліктавага лесу Еўропы. Дзеля таго каб тую заслону перасунуць на Усход, амерыканцы разбурылі цэлую імперыю і надзеі мільёнаў людзей. Дык што ім той спартыўны дух знішчыць. Звычайная «гульня ў гегемона».

Але ёсць Беларусь з сапраўднай культурай, традыцыйнай сям'ёй. Наша краіна зберажэ яшчэ і спартыўныя арэны — ласкава запрашаем на II Гульні краін СНД. Тое, што мы не заходнія сталіцы — мы не крадзем свята спорту, мы яго ствараем — вядома ўсяму кантыненту. У многіх у памяці засталіся II Еўрапейскія гульні — свайго роду Алімпіяда кантынента, якую праводзіла Беларусь. Яны былі не толькі грандыёзнымі, а яшчэ душэўнымі. У абдымкі беларускай гасціннасці прынялі гасцей з усёй шырынёй беларускай душы. Цяпер паўторым. Для спартсменаў і турыстаў з дзясяткаў краін. Да гэтага беларусы падышлі сур'ёзна. Нават у паветры лунае свята спорту. Але для нас звыклая справа прымаць такія фэсты. Бо спартыўная інфраструктура на ўзроўні. У гэтым праяўляецца беларускасць. Гаспадарскі падыход. Гульні пройдуць — беларусам спартыўныя пляцоўкі застануцца. Толькі карыстайся на здароўе!

Але насамрэч карысць ад гульняў не толькі ў тым. Модна казаць аб эканамічных складніках. Дык уявіце, колькі турыстаў прыедзе. Спартыўныя спаборніцтвы — яшчэ і піяр краіны, яе турыстычных магчымасцяў. Калі спадабаецца, то госці будуць вяртацца зноў і зноў. А суседзі па Саюзнай дзяржаве дык і ўвогуле. Нарэшце замест тога ж турэцкага берага рускі чалавек пазнаёміцца з Браслаўскімі азёрамі, мелавымі кар'ерамі пад Ваўкавыскам, загадкавай Прыпяццю. Беларускім замкам турысты сапраўды не даюць «заплюшчыць вочы» і пагрузіцца ў сны іх сівой даўніны. Шматлюдна і ў вялікіх цэнтральных універмагах, і ў маленькіх крамках. Заўжды свецяцца вокны ў нашых атэлях. І гэта гульні яшчэ не пачаліся!

А пра імідж дый казаць не трэба. Адно — «лайкаць інфу» ў сацыяльных сетках, іншая справа — адчуць дух краіны самастойна. Няхай едуць вандроўнікі з розных краін і ўбачаць на свае вочы, як жыве Беларусь! Кажучы па-спартыўнаму, мы ў выдатнай форме! І ў святочным дрэс-кодзе.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ПРАЦАВАЦЬ ЗНАЧЫЦЬ ШЧЫРАВАЦЬ

Жалеза ў жаночых руках

У гэты гарачы для аграрыяў час якраз актыўна асвойваюцца ў калектывах гаспадарак маладыя спецыялісты. Толькі ў Гомельскім раёне, напрыклад, у Галіне сельскай гаспадаркі чакаюць на першыя працоўныя месцы 50 маладых кадраў. Для будучага папаўнення паказальны вопыт пачынаючых аграрыяў, якія ўжо вытрымалі «школу маладога байца». Тым, што значыць быць першай дзяўчынай, якая заступіла на работу ў аўтапарк буйной гаспадаркі, з карэспандэнтам «Звязды» падзялілася Ірына ЖЫХАРАВА. На птушкафабрыку «Рассвет» Гомельскага раёна яна дабіраецца з суседняга Добрушскага. Затое атрымала магчымасць знайсці добрую работу па сваёй спецыяльнасці — слесара па рамонце аўтамабіляў.

Дзяўчына скончыла Прыбарскі дзяржаўны каледж Гомельскага раёна. У ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» праходзіла вытворчую практыку. На адпрацоўку па размеркаванні трапіла ў Брэсцкую вобласць, але пасля вярнулася зноў на Гомельшчыну. У ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» дзяўчына працуе ўжо амаль два гады. Разам з аднавяскоўцамі з аграгарадка Насовічы і жыхарамі іншых вёсак Добрушскага раёна ездзіць на работу ў Пясочную Буду ў Гомельскі раён. Падвоз на аўтобусе работнікаў ажыццяўляе сельгаспрадпрыемства.

— Я слесар па рамонце аўтамабіляў трэцяга разраду, — расказвае пра сябе Ірына. — У мае абавязкі ўваходзіць падтрыманне тэхнікі ў належным стане, правядзенне прафілактычных работ, зарадка акумулятараў, а таксама кантроль за інструментамі, якія выкарыстоўваюцца ў аўтапарку.

У калектыве дзяўчына зарэкамендавала сябе вельмі добра. Адзначылі калегі Ірыну яшчэ падчас праходжання ў гаспадарцы практыкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першая дзяўчына-аўтаслесар ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Гомельскага раёна Ірына ЖЫХАРАВА.

Як падкрэсліла старшыня пярвічнай арганізацыі галіновага прафсаюза ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Вольга ЗАМАЦЕЎСКАЯ, у іх калектыве заўсёды падтрымліваюць маладых і мэтанакіраваных работнікаў. Для маладых кадраў ёсць магчымасць паступіць у ВНУ і прадоўжыць працаваць ужо дыпламаваным спецыялістам.

— З цягам часу Ірына зможа павысіць свой працоўны разрад. У нас на прадпрыемстве дзейнічае ўласная камісія. Калі будзе жаданне і далей вучыцца, то можна стаць і інжынерам, і тэхнікам-механікам, — распавяла Вольга Замацеўская.

— У аўтапарку ўся тэхніка павінна быць спраўнай, выходзіць на лінію, таму работы шмат. Ёсць дзе развівацца ў прафесіі, — перакананая Ірына Жыхарава.

Дарэчы, дзяўчына-аўтаслесар пакарыла калег не толькі належнай работай, але і сваімі спартыўнымі здольнасцямі, якімі цяпер ганарацца ў гаспадарцы. Ірына нечакана нават для сябе ўцягнулася ў грамадскае жыццё калектыву. Яна ніколі не займалася прафесійным спортам, але захапляецца бегам і наогул фізічнымі актыўнасцямі. У складзе каманды дзяўчына брала ўдзел і выдатна выступіла на Рэспубліканскім галіновым турнірэ работнікаў аграпрамысловага комплексу.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Сёлета пятая частка ўсіх купляў будзе ажыццяўляцца анлайн

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Што датычыцца замежных маркетплэйсаў, возьмем дынаміку продажаў найбольш вядомага Amazon. Выручка дадзенага маркетплэйса за 2022 год павялічылася на 9 % — да 513,98 мільярда долараў супраць 469,82 мільярда долараў на год раней. А ў першым квартале ўжо бягучага года ў Amazon чакаюць выручку, якая павялічыцца на 4—8 %», — адзначыў Вячаслаў Сенін.

Віртуальная рэальнасць у дапамогу

Для таго каб прыцягнуць і ўтрымаць пакупнікоў на сваіх пляцоўках, маркетплэйсы выкарыстоўваюць розныя тэхналогіі продажаў і прасоўвання. Напрыклад, у другім паўгоддзі сфера электроннай камерцыі чакае, што будзе запатрабаваны шэраг трэндаў на дадзеным рынку. У першую чаргу гаворка ідзе пра дапоўненую (AR) і віртуальную рэальнасці. Тэхналогія дазваляе пакупнікам лепш уяўляць сабе тавары, якія яны хочуць набыць, а таксама стварацъ больш рэалістычны і захапляльны вопыт куплі. Напрыклад, з дапамогай AR можна прымераць адзенне ці абутак, убачыць, як будзе выглядаць мэбля ў інтэр'еры ці якое адценне памады падыдзе да колеру вашай скуры.

Віртуальная рэальнасць (VR) — гэта створаны камп'ютарам свет, доступ да якога можна атрымаць з дапамогай імерсійных прылад — шлемаў, пальчатак, навушнікаў. Віртуальнае асяроддзе цалкам замяняе рэальны свет, не рэагуючы на вонкавыя змены, пры гэтым карыстальнік можа ўздзейнічаць на яго.

З дапамогай VR можна паглыбіцца ў віртуальны магазін або прайсці інтэрактыўны тур па вытворчасці тавару. Брэнды, якія інтэгруюць гэтыя тэхналогіі ў свае інтэрнэт-крамы або мабільныя дадаткі, могуць атрымаць перавагу перад канкурэнтамі і павысіць узровень даверу і лаяльнасці кліентаў.

Стаўка на штучны інтэлект

Штучны інтэлект (AI) і машыннае навучанне (ML). У дадзеным выпадку тэхналогія дапамагае брэндам аналізаваць вялікія аб'ёмы даных аб паводзінах і перавагах пакупнікоў, а таксама прапаноўваць ім персаналізаваныя рэкамендацыі тавараў, рабіць цанавыя прапановы, праводзіць зніжкі і акцыі. Таксама AI можа выкарыстоўвацца для стварэння чатботаў і галасавых памочнікаў, якія забяспечваюць хуткае і зручнае абслугоўванне кліентаў, адказваючы на іх пытанні, дапамагаючы з выбарам тавару або афармленнем заказу. Брэнды, што выкарыстоўваюць AI і ML для паляпшэння свайго сэрвісу і якасці прадукту, могуць павысіць канверсію і ўтрыманне кліентаў, а таксама знізіць выдаткі на маркетынг і падтрымку.

Выразна вымавіць прасцей, чым правільна набраць

Тут гаворка ідзе пра галасавы і візуальны пошук. Гэтыя функцыі дазваляюць пакупнікам знаходзіць патрэбныя тавары з дапамогай галасавых камандаў або малюнкаў. Галасавы пошук спрашчае жыццё карыстальнікаў, якія аддаюць перавагу вуснай форме каманды, або тых, хто хоча эканоміць час. Візуальны пошук дапамагае пакупнікам знайсці тавары па фота.

Давер нельга купіць, але яго можна стварыць

Дадзены кірунак называецца «сацыяльная камерцыя» (СК). Яна звязаная з продажам тавараў праз сацыяльныя сеткі, такія як Instagram, Facebook, TikTok і іншыя. Сацыяльная камерцыя дазваляе брэндам павялічыць сваю аўдыторыю, павысіць пазнавальнасць і давер да свайго прадукту, а таксама скараціць шлях пакупніка ад прагляду да куплі.

Гэта як у мінулым «сарафаннае радыё». Там пакупнікі могуць лёгка знайсці тавары, якія іх цікавяць, паглядзець водгукі і рэальныя фота ад іншых карыстальнікаў. Дзякуючы СК цяпер можна зрабіць заказ проста ў дадатку сацыяльнай сеткі. Брэнды, што актыўна выкарыстоўваюць сацыяльную камерцыю, могуць атрымаць доступ да мільёнаў патэнцыяльных кліентаў, якія праводзяць шмат часу ў сацыяльных медыя і гатовыя да імпульсіўных трат.

Калі пакупнік — капрыза

Тут падыдзе такое паняцце, як омніканальнасць (ад англійскага «omnichannel») — аб'яднанне ўсіх каналаў камунікацыі кліента з кампаніяй у адзіную сістэму з захаваннем усёй гісторыі зносін і купляў. Омніканальнасць дазваляе брэндам забяспечваць пакупнікам гарманічны вопыт куплі на любой прыладзе і ў любым месцы. Пакупнікі могуць пачаць свой шлях у адным канале, напрыклад, на сайце або ў мабільным дадатку, а скончыць ў іншым, напрыклад, у афлайн-краме або праз дастаўку. Дадзеная сістэма лаяльнасці на практыцы пацвярджае слоган «пакупнік заўсёды мае рацыю». Брэнды, якія рэалізоўваюць омніканальнасць, могуць павысіць задаволенасць кліентаў, а таксама збіраць больш звестак аб іх паводзінах і перавагах.

Сучасная моладзь за справядлівасць галасуе рублём

Устойлівасць і сацыяльная адказнасць становяцца ўсё больш важнымі для сучасных спажыўцоў, асабліва для маладога пакалення. Пакупнікі ўсё больш звяртаюць увагу на тое, як брэнды вырабляюць свае тавары, як яны ўплываюць на навакольнае асяроддзе і грамадства, а таксама як яны ставяцца да сваіх супрацоўнікаў і партнёраў. Фірмы, што дэманструюць сваю ўстойлівасць і сацыяльную адказнасць, могуць прыцягнуць і ўтрымаць кліентаў, якія падзяляюць гэтыя каштоўнасці і гатовыя падтрымаць такія кампаніі. Таксама брэнды могуць выкарыстоўваць такія каштоўнасці, як канкурэнтную перавагу і дыферэнцыяцыю на рынку.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Агенцтва Fitch панізіла доўгатэрміновы рэйтынг ЗША

Доўгатэрміновы рэйтынг дэфолту эмітэнта ЗША ў замежнай валюце з ААА (найвышэйшы ўзровень плацежаздольнасці і мінімальная рызыка дэфолту) паніжаны да АА+ са стабільным прагнозам, паведаміла ТАСС. Як заявілі ў агенцтве, зніжэнне было праведзена з улікам чакання пагаршэння фіскальнай сітуацыі ў найбліжэйшыя тры гады, высокай пазыковай нагрузкі, якая працягвае павялічвацца, а таксама з-за «пагаршэння кіравальнасці на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў, што выявілася ў супярэчнасцях наконт ліміту дзярждоўгу і прыняцці рашэнняў на гэты конт у апошнюю хвіліну». Паніжэнне крэдытнага рэйтынгу можа негатыўна адбіцца на магчымасцях пазычання краіны. У Белым доме і Міністэрстве фінансаў ЗША выказалі незгоду з рашэннем рэйтынгавага агенцтва.

Метэаслужба Пекіна назвала нядаўнія ліўні самымі магутнымі за 140 гадоў



Метэаслужба Пекіна назвала ліўні, якія наваліліся ў апошнія некалькі дзён на кітайскую сталіцу, самымі магутнымі за апошнія 140 гадоў, паведаміла ТАСС. Як адзначаецца на старонцы метэаралагічнага ўпраўлення горада ў сацыяльнай сетцы Weibo, з 29 ліпеня да 2 жніўня «надвор'е было экстрэмальным». Паведамляецца, што на тэрыторыі паўночнага пекінскага раёна Чанпін выпала 744,8 міліметра ападкаў, пры гэтым ранейшы рэкорд, які быў зафіксаваны ў ліпені 1891 года, складаў 609 мм. Метэаралагічнае ўпраўленне ўдакладніла, што статыстыка па такіх прыродных з'явах, як ліўні, вядзецца ў Кітаі са старажытных часоў, але запісы «не ўтрымліваюць дакладных звестак». Паводле афіцыйных звестак, у Пекіне з-за паводак, выкліканых моцнымі дажджамі, загінулі 11 чалавек, яшчэ 27 зніклі без вестак. Улады эвакуіравалі дзясяткі тысяч жыхароў.

У Інданезіі шэсць чалавек, у тым ліку дзіця, загінулі ад засухі

Трагедыя здарылася ў правінцыі Заходняе Папуа, паведаміў інданезійскі партал Grid.ID. «У выніку засухі шэсць чалавек загінулі, людзі ў пацярпелых раёнах галадалі. Шэсць жыхароў, у тым ліку пяцёра дарослых і дзіця, памерлі», — заявіў рэгент акругі Пунчак Вілем Вандзік. Удакладняецца, што ахвяры стыхіі адчувалі такія сімптомы, як агульная млявасць, дыярэя, гарачка, афтозныя язвы і галаўныя болі. Кіраўнік Цэнтра звестак аб стыхійных бедствах Інданезіі Абдул Мухары пацвердзіў, што засуха ў акрузе Пунчак прывяла да неўраджаю. Усяго ад засухі ў той ці іншай ступені пацярпелі 7500 жыхароў. Паведамляецца, што ўлады Інданезіі прынялі рашэнне адправіць экстранную гуманітарную дапамогу ў правінцыю. Адпаведны ўказ падпісаў прэзідэнт краіны Джока Відода. У пакет дапамогі ўвайшла ежа, адзенне, коўдры і медыкаменты.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 (**www.ipmtorgi.by**)
Предмет электронных торгов	

ЧЕТЫРЕХКОМНАТНАЯ КВАРТИРА
(**80,4 кв. м,** инв. № 122/D-7119, в состав квартиры входит кладовая в подвале).
Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-6**

Начальная цена лота (без НДС) – 68 431,19 бел. руб. (снижена на 30 %)

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда от 14.07.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 21.08.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.08.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже:**

Лот № 1:

ЭКСКАВАТОР ОДНОКОВШОВЫЙ ЭО-3223,
2012 г. в., идентификационный номер Y3ЭЭО32230112744.
Начальная цена с НДС (20 %) – **48 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 800,00** бел. руб.

Лот № 2:

АВТОМОБИЛЬ СЕДЕЛЬНЫЙ ТЯГАЧ MAZ-5440 AB-360-031,
2008 г. в., цвет белый, рама № Y3M5440A8E003330, г/н АЕ 7108-5 (разукомплектован, снят с учета).
Начальная цена с НДС (20 %) **– 6 720,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **672,00** бел. руб.

Имущество расположено по адресу:
Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.
Шаг аукциона: 5 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **04.09.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.09.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by
Продавец	СООО «Инвестиционная группа «ИГЕ», г. Минск, ул. Пионерская, д. 5, пом. 1Н, каб. 1
Предмет электронных торгов	

АДМИНИСТРАТИВНО-ТОРГОВОЕ ПОМЕЩЕНИЕ
с инв. № 500/D-7059322, общ. пл. 226,5 кв. м.
Местоположение:
г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н

Начальная цена с НДС 20 % – 298 980,00 долл. США. Шаг торгов – 5 % от текущей цены

**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБ РБ на дату проведения аукциона*

Задаток 1,5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 37853865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.09.2023 г. с 11.00 до 13.00
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приёма заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.09.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Криница» (Продавец)

Аукцион состоится **06.09.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, состав:

1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м,
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение – площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв. м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м.
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), площадь – 11365,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на сайте Организатора аукциона ino.by).
23. Объекты растительного мира (перечень на сайте Организатора аукциона ino.by).

Адрес Лота № 1:
Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6;
Артскважина: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11

Начальная цена с НДС 20 % – 9 168 650,40 руб.
Задаток – 500 000,00 руб.

Земельные участки:
1. 624250100001000118, 5,2100 га;
624250100001000119, 0,3600 га.

Право постоянного пользования. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 04.09.2023 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис» (УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

Аукцион состоится **05.09.2023 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис Организатора аукциона)

Лот № 1:

ПОГРУЗЧИК УНИВЕРСАЛЬНЫЙ АМКОДОР 342С4, 2018 г. в., р/з ТВ-6 7678, зав. №. ABY342C4JJ0002922.
Стрела крановая безблочная 342С.54.00.000. Вилы грузовые АДЗ-342С.01.00.000
Начальная цена продажи – 144 720,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток 14 472,00 бел. руб. Шаг аукциона 7 236,00 бел. руб.

Местонахождение лота: **Могилевская обл., Хотимский р-н, д. Забелышин, ОАО «Бабушкино подворье»** (контактное лицо для осмотра – Павел Владимирович тел. 8-033-33-00-466). Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901.

Срок подачи документов **до 12.00 04.09.2023.** Срок подписания договора купли-продажи – 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «ПМК-188» (222357, Минская обл., г. Воложин, ул. Пушкина, 24) **проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Вагон-дом ВД-2, 1980 г. в.	8921	564,00	56,00
2	Вагон-дом ВД-2, 1980 г. в.	8922	960,00	96,00
3	Вагон-дом на колесном шасси, 1981 г. в.	18 926	312,00	31,00
4	Вагон-дом (кунг) на шасси от автомобильного прицепа 2ПН-2, год выпуска не установлен	12529	570,00	57,00
5	Штукатурная станция ШС-4/6, 2010 г. в.	12486	5 760,00	576,00
6	Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100, 2010 г. в., регистрационный знак А 9318 А-5, рама № Y3M857100A0006820, цвет – светло-серый	116798	2 040,00	204,00
7	Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100-010, 2008 г. в., регистрационный знак отсутствует, рама № Y3M85710080000453	116738	1 500,00	150,00
8	Бункер БН-1,0 СТШИ.Б-0,38.000, 2014 г. в.	116859	546,00	54,00
9	Бункер БН-1,0 СТШИ.Б-0,38.000, 2014 г. в.	12557	480,00	48,00
10	Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100-010, год выпуска не установлен, регистрационный знак отсутствует, № рамы не установлен	12605	1 800,00	180,00
11	Штукатурная станция СШВ-4, 2010 г. в., на шасси прицепа ПТ-7	116788	6 120,00	612,00
12	Автомобиль легковой седан ВАЗ-21074, 2008 г. в., регистрационный знак 7386 ЕР-5, кузов № ХТА21074082734306, цвет – сине-зеленый	116775	534,00	53,00
13	Автобус Mercedes-Benz 310 КВ, год выпуска не установлен, регистрационный знак АО 5874-5, кузов № WDB6020771P290629, цвет – бело-зеленый	12575	1 860,00	186,00

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Пушкина, 24.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Начальная цена лотов снижена на 50 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55 BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 25.01.2023, 18.03.2023, 11.05.2023, 15.06.2023.

Аукцион состоится **17.08.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.08.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600019633

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 ЖНІЎНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15959)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Настасся ШВЯДКО:

«КАЛІ ЛЮБІШ ТОЕ, ШТО РОБІШ, НЕ БУДЗЕШ АДЧУВАЦЬ АНІЯКАЙ СТОМЫ»

Наша гераіня ўпэўненая: ніколі не трэба адмаўляцца ад сваёй мары. Яна з дзяцінства любіла народную творчасць і ў сям'і дачку падтрымлівалі ва ўсіх яе пачынаннях, прывівалі ёй любоў да роднай культуры, літаратуры і музыкі. Таму ўжо ў два з паловай гады будучая артыстка ўпэўнена чытала вершы і спявала. Сёння арт-дырэктар і салістка ВІА «Грай, музыкі!» Настасся Швядко ганарыцца, што ўсё ж такі не здрадзіла сваёй дзіцячай мары і стала артысткай.

Спявачка згадвае, як аднойчы з бабуляй пайшла на канцэрт у мясцовы Дом культуры, дзе яна, маленькая, упершыню пачула і ўбачыла цымбалы. З таго часу гэты дзіўны інструмент стаў неад'емнай часткай жыцця нашай гераіні. Наста дзеліцца, як адразу ж запісалася на цымбалы. «Прыйшла дамоў да бацькоў і сказала: давайце грошы, я буду музыкантам», — з усмешкай кажа яна.

Акрамя «музыкалкі», з першага класа ў сваёй роднай расонскай школе Наста займалася ў фальклорным танцавальным калектыве «Нежачкі». Як тлумачыць сама дзяўчына, яна заўсёды хацела стаць артысткай, таму ніякіх сумневаў не было, нават калі яе стараліся адгаварыць. Вялікую ролю тут адыгралі выкладчыкі. Яны падтрымлівалі і ведалі, як прывіць любоў да музыкі. «Калі ты бачыш, наколькі справа падабаецца чалавеку, у яго вельмі класна вучыцца. Ён з усёй любоўю перадае табе тое, што дорага яму», — перакананая салістка.

Таленавітая вучаніца іграла ў цымбальным аркестры, саліравала ў дзіцячым хоры «Медуніца», актыўна брала ўдзел у шматлікіх конкурсах цымбалістаў. «У мяне не было сумневаў, што я пайду «па музыцы», а іншае — хімія, матэматыка — зусім не цікавіла, таму творчасць займала ўвесь мой вольны час», — гаворыць Наста.

Пасля заканчэння музычнай школы паступіла ў Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж па спецыяльнасці «Дырыжыраванне, народны хор». «Я рыхтавалася паступаць на два аддзяленні адразу, — успамінае дзяўчына, — і на цымбалы, і на хор. Не магла выбраць нешта адно — хацела і спяваць, і іграць на цымбалах. Урэшце вырашыла, што два аддзяленні не пацягну, і зразумела, што спяваць мне падабаецца больш. Пасля скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

За плячыма артысткі — работа ў фальклорным ансамблі «Грамніцы» і заслужаным калектыве Рэспублікі Беларусь ансамблі песні і танца «Спатканне», з якім звязана шмат цёплых успамінаў. Менавіта ў гэты калектыў яна прыйшла хормайстрам па размеркаванні. «Сказаць, што гэта проста калектыў, я не магу, — прызнаецца Наста. — Гэты калектыў — душа. Па-іншаму і не назавеш».

Аматарскі калектыў адрозніваецца сваёй спецыфікай ад прафесійнага, тлумачыць спявачка і дадае, што яго ўдзельнікаў не прымусіш ніколі штосьці рабіць, пакуль не заспявае душа альбо не зацікавіш.

Менавіта ў «Спатканні» дзяўчына атрымала першы досвед работы з людзьмі. У той час яна была зусім нявопытная, а большасць удзельнікаў значна старэйшая за яе... Маладая хормайстар вучылася знаходзіць агульную мову з усімі, нягледзячы на розніцу ва ўзросце. Дзякуючы дасведчанаму кіраўніку ансамбля і, на той момант, начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага раёна Сяргею Кудзіну Наста вучылася і пераймала вопыт работы ў калектыве. Парады Сяргея Сцяпанавіча дапамагалі маладой спецыялістцы, надавалі аптымізму і ўпэўненасці. На жаль, у 2017-м калектыў завяршыў сваю дзейнасць.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Эх, каб яшчэ...

І НА СУШЫ, І НА ВАДЗЕ

Школа жыцця для байца студатрада матросаў-ратавальнікаў

У летнія месяцы на вадаёмах павялічваецца колькасць адпачывальнікаў, і, вядома, рэжым нясення службы ратавальнікаў на вадзе становіцца вельмі напружаным. Супрацоўнікам такіх станцый добра дапамагаюць байцы студатрадаў матросаў-ратавальнікаў. Сёлета дзевяць студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны ў свой летні адпачынак працаўладкаваліся і нясуць аператыўныя дзяжурствы на вадаёмах. Служба — напружаная фізічна, бо змены прыходзяцца і на «гарачыя» часы пік, а з-за адказнасці за бяспеку людзей — і вельмі складаная маральна.

Работа на выратавальным пасту — школа жыцця для студэнтаў. У гэтым на сваім вопыце давялося пераканацца гамяльчаніну Паўлу П'ЯНКОВУ. Для яго гэта магчымасць навучыцца ўпэўнена даносіць інфармацыю да людзей старэйшых за яго па ўзросце, прычым так, каб сапраўды паўплываць сваім словам.

Павел перайшоў на трэці курс, вучыцца на факультэце псіхалогіі і педагогікі. Працаўладкаваўся на лета ў сэрвісны атрад пасля звароту ва ўніверсітэцкую «пярвічку» БРСМ. Для таго каб трапіць у студатрад матросаў-ратавальнікаў, хлопец прайшоў адбор.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Даніна пашаны

БУДАЎНІЦТВА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ЦЭНТРА — БУДАЎНІЦТВА БУДУЧЫНІ

БРСМ пры падтрымцы Штаба патрыятычных сіл Беларусі адкрыў дабрачынны рахунак для збору сродкаў на будаўніцтва патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці.

«Вельмі важна, калі такую ініцыятыву падтрымаюць не асобныя арганізацыі або грамадзяне, а ўся беларуская грамадскасць. Будаўніцтва цэнтра — гэта будаўніцтва будучыні нашай краіны», — сказаў першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў.

Днямі па ініцыятыве ЦК Саюза моладзі ў Цэнтральным Доме афіцэраў адбылося пасяджэнне Штаба патрыятычных сіл з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства абароны, Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і Брэсцкага дзяржаўнага абласнога Цэнтра маладзёжнай творчасці. Сустрэча ў такім складзе была нацэлена на кансалідацыю намаганняў грамадства па зборы сродкаў на стварэнне Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці. Цяпер актыўна ідзе першы этап стварэння адукацыйна-аздараўленчай установы «Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі» на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. Ініцыятыва будаўніцтва ўнікальнага аб'екта ў знакавым гістарычным месцы падтрымана Прэзідэнтам. Абвешчаны збор сродкаў. Частка сабранай на рэспубліканскім суботніку сумы ўжо накіравана на дабрачынны рахунак праекта. Паступаюць сродкі ад грамадзян і арганізацый. На пачатак жніўня ўжо было сабрана 7,5 мільёна рублёў.

БРСМ стварыў відэаролік «Пабудуем патрыятычны цэнтр разам» і распрацаваў лістоўку з QR-кодам, яна накіроўвае на старонку АРІП, дзе пазначаны дабрачынны рахунак. Чалавеку, які хоча ўнесці свой уклад у добрае пачынанне, трэба толькі запоўніць графу «сума».

У дзень Беларускіх студэнцкіх атрадаў — галоўнага свята БСА, якое мае гістарычныя карані і якое ўдзельнікі маладзёжнага працоўнага руху традыцыйна адзначаюць штогод 1 жніўня, акцэнт байцы студатрадаўскага руху зрабілі на працу і патрыятызм. Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў даў старт маладзёжнай працоўнай акцыі «Усебеларускі дзень ударнай працы». Яна прайшла на рабочых месцах, дзе шчыруюць хлопцы і дзяўчаты ў складзе студатрадаў. Усе зароблены ў гэты дзень сродкі будуць накіраваны байцамі БСА на дабрачынны рахунак, адкрыты БРСМ для будаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
03 08 2023 г.

Прафарыенцір

НОВЫЯ РЭКОРДЫ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ

Якія вышыні давялося пакараць абітурыентам 2023 года?

Гэтымі днямі ў беларускіх ВНУ завяршаецца залічэнне на бюджэтную форму навучання. Як і чакалася, прахадныя балы сёлета істотна ўзраслі (бо колькасць вынікаў, блізкіх да ста, па ўсіх дысцыплінах на цэнтралізаваным экзамене і ЦТ аказалася незвычайна высокай), а на самых прэстыжных спецыяльнасцях яны наблізіліся да свайго максімуму.

Гістарычны максімум у БДУ

Для Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта высокія прахадныя балы — не навіна, а, хутчэй, норма, але і тут былі пабітыя леташнія рэкорды. Так, каб паступіць на спецыяльнасць «Міжнароднае права», трэба было набраць не менш як 398 балаў з 400 магчымых (у 2022 годзе — 374), «Міжнародныя адносіны» — 394 (летась — 377), «Сусветная эканоміка» — 385 (у 2022 годзе — 364); «Менеджмент» (на эканамічным факультэце) — 388 (у 2022 годзе — 360), «Усходазнаўства» — 393, «Прыкладная інфарматыка» — 386 (у 2022 годзе — 372).

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт паспяхова выканаў набор на дзённую бюджэтную форму навучання. Агульны конкурс склаў 1,7 чалавека на месца. Без уступных іспытаў у БДУ будуць залічаны 325 абітурыентаў, што складае 15 % ад кантрольных лічбаў прыёму. Сярод тых, хто падаў дакументы, 79 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Такі высокі працэнт, як растлумачыў **рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ,** абумоўлены новымі правіламі прыёму, арыентаванымі на матываваную моладзь. Сярод абітурыентаў БДУ вырас працэнт тых, хто скончыў сярэднюю школу з медалём або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з дыпломам з адзнакай. Іх колькасць склала 910 чалавек. Гэта 25 % ад агульнай колькасці тых, хто падаў дакументы. Акрамя таго, 1530 чалавек, або 42 % ад агульнай колькасці тых, хто падаў дакументы, скончылі ліцэі і гімназіі.

Па словах рэктара, яго вельмі радуе ўзровень падрыхтаванасці абітурыентаў: «Сёлета мы дасягнулі гістарычнага максімуму. У нас 80 % абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у агульным конкурсе, маюць сумарны бал вышэйшы за 300. Гэтая лічба на 13 працэнтных пунктаў перавышае леташні паказчык. Яшчэ адным фактам, які пацвярджае якасную і адказную падрыхтоўку абітурыентаў, з'яўляецца істотнае павелічэнне колькасці маладых людзей са стабальнымі вынікамі па ЦЭ і ЦТ. Сёлета ў БДУ пададзена 579 стабальных сертыфікатаў: самая вялікая колькасць па рускай мове (128) і матэматыцы (109).

Таксама Андрэй Кароль расказаў, на якія спецыяльнасці, дзе праводзяцца ўнутраныя выпрабаванні, склаўся найбольш высокі конкурс. На «Графічны дызайн і мультымедыядызайн» — 14,8 чалавека на месца, «Дызайн касцюма і тэкстылю» — 5,2 чалавека на месца, «Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя» — 8,2 чалавека на месца. Прымаючы дакументы, прыёмная камісія сутыкнулася з тым, што прыйшлося адшукваць дадатковыя рэсурсы для правядзення творчага іспыту для ўсіх ахвотных абітурыентаў і выдзяляць аўдыторыі для іх работы (частка іспыту — класічны малюнак), пашыраць прадметную камісію.

На завочнай бюджэтнай форме навучання конкурс у БДУ таксама аказаўся высокі — 1,7 чалавека на месца (на 150 месцаў было пададзена 260 заяў). На скарочаны тэрмін навучання конкурс — 2,2 чалавека на месца.

Праграмісты і архітэктары

У БДУІР конкурс адбыўся па ўсіх 15 спецыяльнасцях. **Рэктар Вадзім БОГУШ** адзначае цікавасць да кірункаў, звязаных з мікраэлектронікай, штучным інтэлектам. Прыёмнай камісіяй рэкамендаваны да залічэння 1065 абітурыентаў на шэсць грамадзянскіх факультэтаў і 105 — на ваенны, на бюджэт завочнай формы — 35.

Самымі папулярнымі спецыяльнасцямі сталі «Праграмная інжынерыя» (прахадны бал — 394), «Электронная эканоміка» (393). Недалёка ад іх размясціліся «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (391) і «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» (389). На ўсе астатнія спецыяльнасці праходны бал перавысіў 310.

А на спецыяльнасць «Электронныя сістэмы і тэхналогіі», якая трапіла ў пералік найбольш запатрабаваных эканомікай, зусім не было конкурсу — на яе рэкамендавалі да залічэння пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд і медалістаў, што стала ўнікальным выпадкам у гісторыі ўступнай кампаніі ў БДУІР.

Трэба заўважыць, што ў БДУІР конкурс праводзіцца па групе факультэтаў і групе спецыяльнасцяў. Абітурыенты маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты. Калі абітурыент не праходзіць па балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей да таго часу, пакуль ён або не будзе залічаны, або не скончацца спецыяльнасці, указаныя ім у заяве. Гэта значна спрашчае запаўненне бюджэтных месцаў у тым ліку і па менш запатрабаваных моладдзю спецыяльнасцях. А для абітурыентаў менш шанцаў застацца «за бортам».

У БНТУ топ-3 спецыяльнасцяў з самым вялікім конкурсам узначаліў «Маркетынг», дзе конкурс склаў 22 чалавекі на месца (прахадны бал — 379). Далей ідзе «Бізнес-адміністраванне» — 7,7 чалавека на месца (прахадны бал — 371). Прывабліваю абітурыентаў і «Архітэктурны дызайн» — адна з самых творчых і крэатыўных у сферы праектавання і будаўніцтва спецыяльнасць. Конкурс пры падачы дакументаў па прафілізацыі «Урбаністыка і дызайн архітэктурнага асяроддзя» складае 4,1 чалавека на месца. Тут залічэнне пакуль не адбылося, бо абітурыенты здаюць творчы экзамен.

Падводзячы прамежкавыя вынікі прыёмнай кампаніі, **рэктар БНТУ Сяргей ХАРЫТОНЧЫК** адзначыў: «Для нас асабліва важны выбар БНТУ выпускнікамі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, пераможцамі алімпіяд і медалістамі. Новай практыкай для нас сталі сумоўі з выпускнікамі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Такі фармат залічэння, як сумоўе, вельмі эфектыўны, бо дапамагае ўбачыць, наколькі будучы студэнт заматываваны паступіць і ў далейшым атрымліваць адукацыю па той ці іншай спецыяльнасці. Сёлета лічбы выглядаюць такім чынам: ад медалістаў у прыёмную камісію паступіла 306 заяў, тры пададзеныя выпускнікамі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, яшчэ тры — пераможцамі рэспубліканскіх алімпіяд. Таксама хочацца дадаць, што сёлета павялічылася колькасць абітурыентаў са стабальнымі сертыфікатамі — такіх у нас 56».

Сярэдні конкурс па БДПУ склаў больш за тры чалавекі на месца. Самы высокі конкурс — на спецыяльнасці «Арганізацыя і кіраванне фізічнай культурай, спортам і турызмам» (6 чалавек на месца), «Псіхалогія» (5,8) і «Фізічная культура» (4,2).

На рэгіянальным узроўні

Што датычыцца медыцынскіх універсітэтаў, якія абітурыенты ніколі не абыходзяць сваёй увагай, то і тут былі зафіксаваныя фантастычныя прахадныя балы. Гэта тлумачыцца яшчэ і тым, што асноўная колькасць бюджэтных месцаў у ВНУ Міністэрства аховы здароўя запоўнілася яшчэ ў чэрвені ў рамках мэтавага набору, што сур'ёзна павысіла канкурэнцыю. Так, для прыкладу, у Віцебскім дзяржаўным медуніверсітэце ахвотным стаць стаматолагамі трэба было мець у сваім багажы не менш як 392 балы.

Увогуле, па словах **міністра адукацыі Андрэя ІВАНЦА,** рэгіянальныя ВНУ сёлета спрацавалі добра. У Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава сярэдні конкурс — 2,4 чалавека на месца, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы — 2,2 чалавека на месца. У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны і Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна конкурсы набліжаюцца да паказчыка два чалавекі на месца.

Такая папулярнасць рэгіянальных ВНУ, на думку міністра, звязаная з правядзеннем універсітэцкіх алімпіяд (яны былі ўведзены ў 2022/2023 навучальным годзе), якія прайшлі ва ўсіх рэгіянальных ВНУ, і кірмашоў вакансій для мэтавага набору. Нагадаем, што сёлета для тых, хто прэтэндаваў на мэтавыя месцы, была створана асаблівая траекторыя паступлення: яны здавалі толькі адзін іспыт па профільным прадмеце ў вуснай форме прыёмнай камісіі, створанай у ВНУ, а тэрміны прыёмнай кампаніі былі выдзелены для іх у асобны этап.

Так, у лік студэнтаў першага курса Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы залічаны 163 абітурыенты — мэтавікі і пераможцы ўніверсітэцкай алімпіяды. Скарысталіся новаўвядзенне прыёмнай кампаніі бягучага года — магчымасцю паступіць па выніках універсітэцкай алімпіяды — 35 маладых людзей. Гэта прызёры алімпіяды, якім для паступлення ў ВНУ не трэба было здаваць ЦЭ і ЦТ. У Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце студэнтамі першага курса сталі 16 абітурыентаў, якія перамаглі ва ўнутрыўніверсітэцкай алімпіядзе.

МДПУ імя І. П. Шамякіна залічыў на першы курс 48 мэтавікоў і 19 пераможцаў універсітэцкай алімпіяды.

У лік студэнтаў ГДУ імя Францыска Скарыны ў чэрвені залічаны 129 абітурыентаў: 110 мэтавікоў і 19 пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд.

Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, у бягучым годзе ў ВНУ праз універсітэцкія алімпіяды паступілі 369 абітурыентаў. На думку кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў, правядзенне такіх інтэлектуальных спаборніцтваў дапамагае зменшыць адток у сталіцу найбольш падрыхтаваных і матываваных хлопцаў і дзяўчат, якія ў выпадку паступлення ў сталічныя ВНУ дадому часцей за ўсё ўжо не вяртаюцца.

Па мэтавым наборы статыстыка наступная: на мэтавыя месцы былі залічаны 3395 чалавек. Каб прыём на мэтавае месца адбыўся, ВНУ мусілі правесці конкурсны адбор, гэта значыць, што колькасць пададзеных заяў ад абітурыентаў павінна была перавышаць колькасць выдзеленых месцаў. З гэтай прычыны некаторыя мэтавыя месцы засталіся вакантнымі і былі перададзены на агульны конкурс. План мэтавага набору па ўсіх ВНУ быў выкананы на 74 працэнты.

Каб не застацца «за бортам»

Залічэнне на бюджэтныя месцы ў большасці ВНУ павінна завяршыцца да 4 жніўня. Але ўжо сёння некаторыя ВНУ праінфармавалі пра месцы, што засталіся вакантнымі. Сярод іх БДПУ (фізіка-матэматычны профіль), Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Мазырскі педуніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.

Дадатковы набор у ВНУ — адзін з этапаў тэхналогіі прыёму на бюджэт. Ён існуе для таго, каб усе месцы, што засталіся вакантнымі пасля асноўнага набору (а гэта нармальная з'ява ў адносінах да спецыяльнасцяў, якія ў меншай ступені запатрабаваныя абітурыентамі, але моцна запатрабаваныя эканомікай), былі запоўненыя. Бо часта, кіруючыся амбіцыямі, абітурыент робіць свой выбар на карысць нейкай больш прэстыжнай, на погляд моладзі, спецыяльнасці. Потым высвятляецца, што яму не хапае балаў, але ён да апошняга трымаецца за тую спецыяльнасць, спадзяецца, што ў кагосьці не вытрымаюць нервы і ён забярэ дакументы, а гэтага не адбываецца. І абітурыент застаецца «за бортам». А дадатковы набор дазваляе абраць з ліку спецыяльнасцяў, дзе засталіся незапоўненыя месцы, блізкія абітурыенту, і паступіць на бюджэтную форму навучання. Летась былі выпадкі, калі падчас дадатковага набору на асобныя спецыяльнасці конкурс, прахадны бал і якасны склад абітурыентаў былі нават вышэйшыя, чым падчас асноўнага набору. Таму ў абітурыентаў, якім не пашанцавала, яшчэ ёсць шанц стаць студэнтамі бюджэтнай формы навучання. Прыёмныя камісіі чакаюць ахвотных да 6 жніўня. Або маладыя людзі могуць падаць дакументы на платную форму навучання. Зрабіць гэта трэба не пазней 9 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Абсалютны вынік на ЦТ у бягучым годзе паказалі 599 абітурыентаў у 619 выпадках па 14 прадметах, прычым у дваццаці абітурыентаў ёсць адразу два стабальныя сертыфікаты. Для параўнання: у 2022 годзе было 337 чалавек, якія паказалі стабальныя вынікі ў 361 выпадку.

На цэнтралізаваных экзаменах таксама было зафіксавана шмат максімальных вынікаў. У 29 абітурыентаў па выніках здачы двух ЦЭ і аднаго ЦТ агульная сума балаў — 300, а ў 242 абітурыентаў — два стабальныя сертыфікаты.

Спецыялісты Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў плануюць разгледзець магчымасць вяртання ў тэсты заданняў пятага ўзроўню складанасці, якія дазваляюць ранжыраваць самых падрыхтаваных абітурыентаў.

Новыя старты

НАШ «ДРАЙВ» ДЛЯ ТАТАРСТАНА

Студэнцкі педагагічны атрад «Драйв» імя Героя Савецкага Саюза В. Г. Клачкова выехаў на работу ў два дзіцячыя аздараўленчыя лагеры ў Казані (Рэспубліка Татарстан) — «Мару» і «Дзяржынец».

Фота з сайта БРСМ.

Байцы атрада — гэта дзевяць студэнтаў факультэта пачатковай і музычнай адукацыі, факультэта фізічнага выхавання Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова.

Яны будуць працаваць выхавацелямі да 29 жніўня. У дзіцячым аздараўленчым лагеры «Мара» гэта ваенна-патрыятычная і экалагічная змены, у лагеры «Дзяржынец» — спартыўная змена і змена па праграме «Горад бяспекі».

Сёння за межамі Беларусі ў «Арляняці» працуюць студэнцкія педагагічныя атрады «Дзеці Нёмана» імя Героя Савецкага Саюза В. А. Дзямідава, а таксама «Фенікс» імя Героя Савецкага Саюза А. С. Азончыка і «Арляняты» імя Героя Савецкага Саюза Р. К. Дзянісенкі з Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага і Магілёўскага рэгіёнаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ці сабе, і людзям

На дзяжурстве — «Медыкус»

Упершыню ў гісторыі маладзёжнага руху Беларусі ў Наваполацку — маладзёжнай сталіцы — разгарнуўся рэспубліканскі медыцынскі працоўны праект пад такой назвай. Ён працягнецца да канца жніўня.

Праект аб'яднаў каля 50 студэнтаў і навучэнцаў прафільных медыцынскіх устаноў адукацыі з Беларусі і Расіі і рэалізоўваецца ва ўстановах аховы здароўя Наваполацка і Полацка: Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы і Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы, дзе маладыя людзі працуюць у якасці малодшага і сярэдняга медыцынскага персаналу і развіваюць свае навыкі.

«Гэта яскравы прыклад таго, як маладзёжныя ініцыятывы знаходзяць сваё ўвасабленне, ажыццяўляюцца, — сказаў другі сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр Прохараў. — Маладыя людзі агучылі на адной з дыялогавых пляцовак прапанову аб тым, што было б выдатна арганізаваць працоўны праект для навучэнцаў і студэнтаў — будучых медработнікаў. Дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя, Міндукацыі і горада Наваполацка Рэспубліканскаму штабу студэнцкіх атрадаў БРСМ у год 60-годдзя Беларускіх студэнцкіх атрадаў дадзены праект удалося запусціць. Удзельнічаючы ў прафільным працоўным праекце, маладыя людзі не толькі знаёмяцца з умовамі, якія створаныя ва ўстановах аховы здароўя, але самае галоўнае — атрымліваюць практычныя навыкі сваёй будучай прафесіі».

У праекта дастаткова шырокая геаграфія: Віцебск, Гродна, Слуцк, Полацк, Мінск, Воронеж. У ім бяруць удзел байцы студэнцкіх медыцынскіх атрадаў «Героі нашага часу» імя Героя Савецкага Саюза П. У. Несцяровіча (сфарміраваны на базе Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта), «Адрэналін» імя ганаровага пагранічніка Рэспублікі Беларусь, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Р. І. Абялеўскага (на базе Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і медыцынскага каледжа), «Медык» імя Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанкі (Полацкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа), NaCl імя Героя Сацыялістычнай Працы С. І. Шклярэўскага (Слуцкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа), «Добрае сэрца» імя Героя Савецкага Саюза Г. К. Пятровай (Мінскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта). Больш за тое, даведаўшыся пра такую ініцыятыву, на конкурснай аснове ў праекце ўдзельнічае студатрад «Флагман» Варонежскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта імя М. М. Бурдэнкі (Расійская Федэрацыя).

Фота з сайта БРСМ.

«Байцы прыступілі да работы, і мы ўжо атрымліваем зваротную сувязь ад устаноў аховы здароўя — станоўчыя водгукі, — адзначыў другі сакратар ЦК БРСМ. — Галоўная каштоўнасць — здароўе нацыі, дабрабыт дзяржавы і яе далейшае развіццё. Безумоўна, нашы будучыя медработнікі з высокай ступенню адказнасці разумеюць важнасць і значнасць захавання здароўя насельніцтва».

Для ўдзельнікаў працоўнага праекта таксама падрыхтавана шырокая культурна-забаўляльная праграма: творчыя і спартыўныя фестывалі, знаёмства з самым маладым горадам Беларусі — Наваполацкам і самым старажытным горадам — Полацкам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

І НА СУШЫ, І НА ВАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Неабходна было атрымаць заключэнне медыцынскай камісіі, а пасля здаць іспыт па плаванні і ўменні затрымліваць дыханне. Таксама праходзілі навучанне і праверку веславання, аказання першай дапамогі чалавеку, правяраліся і навыкі работы з выратавальным кругам і сродкам для аказання дапамогі тапельцам — канцом Аляксандрава.

— У нас невялікая група ва ўніверсітэце, 12 чалавек. Акрамя мяне, яшчэ адзін хлопец з маёй групы таксама прайшоў у студатрад матросаў-ратавальнікаў. Аднагрупнікі, як толькі я выйшаў на работу, цікавіліся і ўсё распытвалі, — тлумачыць Павел.

Байца студатрада прынялі на выратавальны пост на адным з ажыўленых пляжаў горада па вуліцы Барадзіна. На пляжы — вельмі папулярная ў гараджан зона для купання, акрамя таго арганізаваны пракат катамаранаў і сапбордаў. Досыць шмат на вадаёме і рыбакоў, якія прыходзяць вудзіць у баку ад зоны купання, але таксама знаходзяцца ў зоне адказнасці матросаў-ратавальнікаў. Таму дзяжурствы супрацоўнікаў выратавальнага паста вельмі напружаныя, працуюць яны з 9 да 21 гадзіны.

Павел П'янкоў заступіў на работу з першага мая, а скончыць працоўную вахту толькі 30 жніўня. Каб працаўладкавацца, хлопцу не прыйшлося здаваць сесію датэрмінова. Супрацоўнікі выратавальнага паста так склалі графік, каб студэнту не даводзілася прапускаць залікі і экзамены. Да сесіі малады чалавек рыхтаваўся ў свае выхадныя і ўсё здаў добра.

— Я ніколі не займаўся спортам прафесійна, але фізічна добра

развіты, гэта дапамагло лёгка прайсці і адбор у матросы-ратавальнікі. Звычайная мая змена з 13 да 21 гадзіны, але не кожны дзень, а як размяркоўваем па графіку. Дзяжурства нясу як на сушы, так і на вадзе ў лодцы. Часцей за ўсё ў гэты час даводзіцца папярэджваць, спыняць адпачывальнікаў, якія вісяць на буях ці, наадварот, заплываюць далёка за іх, сплываюць на матрацах, што катэгарычна забаронена. Некалькі разоў дапамагаў дабрацца да берага хлопцам, якія адплылі на значную адлегласць і не маглі вярнуцца назад да берага. На павышаным кантролі заўсёды дзеці ў вадзе, нягледзячы на тое, што адасоблена спецыяльная купальня для малых, — уводзіць у нюансы несення службы баец студатрада.

Нягледзячы на яго юны выгляд, адзначае малады чалавек, адпачывальнікі прыслухоўваюцца да заўваг, форма матроса-ратавальніка дысцыплінуе іх. Падчас нясення службы на пасту сярод супрацоўнікаў няма ніякіх скідак на статус студэнта. Усе павінны выконваць свае абавязкі і несці адказнасць.

— Хацеў бы налета зноў тут працаваць. Для мяне гэта не толькі магчымасць зарабіць. Я хацеў выпрабаваць сябе ў дарослым жыцці. Бо другі курс скончыў, а ні разу нідзе не працаваў, гэта таксама дрэнна, лічу. Трэба было з нечага пачынаць, і тут такая магчымасць. Тры месяцы таму стаў жыць асобна ад бацькоў, здымаць кватэру разам са сваёй дзяўчынай. Так што заробленае не марную, усё ў сям'ю, — прызнаецца малады чалавек.

Баец у студатрадзе матросаў-ратавальнікаў, дарэчы, зарабляе да 700 рублёў за месяц.

Старшы гомельскага выратавальнага паста на вадаёме па вуліцы Барадзіна Міхаіл Крэцінін адзначае адказнае стаўленне студэнтаў да выканання сваіх вельмі важных абавязкаў у рабоце.

— За гэты сезон выцягнулі двух чалавек: мужчыну-інваліда, які прыйшоў на рыбалку і зваліўся ў ваду ў чароце. І непаўналетняга, які заплыў за буйкі пасля папярэджання, не змог сам плыць назад, яму аказалі дапамогу і даставілі на бераг, — распавёў Міхаіл Ігаравіч. — Для студэнтаў гэты жыццёвы досвед надзвычай карысны. Яны вучацца ўменню камунікаваць з людзьмі. Хлопцы вучацца так зрабіць заўвагу, калі адпачывальнікі парушаюць правілы знаходжання на вадаёме, каб гэта было карэктна, не нахаміць, не нагрубіць, а здолець данесці інфармацыю аб неабходнасці бяспечных паводзін. Здараецца, што адпачывальнікі ўспрымаюць у штыкі, калі ім нешта раіць, павучае малады хлопец. Задача матросаратавальніка — змагчы данесці, што за іх папярэджаннямі — жыццё чалавека, жыццё дзіцяці, якое прыйшло на вадаём.

Дарэчы, студэнцкія атрады матросаў-ратавальнікаў на Гомельшчыне ўпершыню фарміравалі ў 2019 годзе. Гэта быў новы вопыт у краіне і абсалютна новая летняя форма занятасці для моладзі. Як растлумачыла сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ універсітэта Дар'я Сінкевіч, калі ў пачатку адбору ў сэрвісныя студатрады матросаў-ратавальнікаў уступалі студэнты факультэта фізічнай культуры, то пасля сталі адбірацца і студэнты іншых факультэтаў: будучыя геолагі, юрысты, псіхолагі. За мінулыя гады ў студатрад матросаў-ратавальнікаў прымалі ад 9 да 20 байцоў, якія скончылі другі і далей курс універсітэта. Папярэднія два гады нароўні з юнакамі неслі службу ратавальнікаў і дзяўчаты. Сёлета ў студатрадзе такога профілю задзейнічаныя толькі хлопцы. Гэта студэнты факультэтаў фізічнай культуры і псіхалогіі і педагогікі.

— Аб магчымасці ўступіць у студатрад мы загадзя, у пачатку навучальнага года, інфармуем усіх праз дэканаты, сацыяльныя сеткі ўніверсітэта, прафсаюзны камітэт. У канцы працоўнай вахты ўсіх студатрадаў падводзім вынікі летняй занятасці студэнтаў. Па выніках работы ў 2020 годзе, напрыклад, наш студатрад матросаў-ратавальнікаў быў прызнаны найлепшым у краіне сэрвісным атрадам, — адзначыла маладзёжны лідар гомельскай ВНУ Дар'я Сінкевіч. — Сёлета ва ўніверсітэце ў цэлым у студатрадах работу атрымала больш за 245 студэнтаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

ЧАРАЎНІЦТВА, ЯКОЕ СТАЛА СЭНСАМ ПРАФЕСІІ І ЖЫЦЦЯ

Малады кіраўнік вытворчасці паперы са Шклова пра сваё прызванне, ініцыятыўных людзей і перадавыя тэхналогіі

КАБ зразумець, наколькі Ягор ТУРБАЛ захоплены чалавек, дастаткова сказаць, што нават казкі на ноч сваёй малодшай дачцэ ён расказваў пра стварэнне паперы. Прычым так заўзята, што яна на наступны дзень прасіла паўтарыць. Хоць, сапраўды, ці не казка гэта, калі з бясформеннай драўнянай масы нараджаецца аснова для газеты, мэблі, будматэрыялаў і шмат іншага, без чаго мы не можам уявіць сабе наша камфортнае жыццё. Ягор і работу сваю ўспрымае як нейкае чараўніцтва, цалкам паглыбляецца ў яе, як цікаўны аквалангіст у бяздонныя глыбіні акіяна. Дасканаласць — гэта, бадай, асноўная рыса яго характару. Невыпадкова, што за дзесяць гадоў сваёй работы на галоўным беларускім прадпрыемстве па вырабе газетнай паперы ён прайшоў кар'ерны рост ад начальніка змены вытворчасці да начальніка вытворчасці.

Прафесію вызначыла хімія

Ягор — чалавек з агеньчыкам. Калі ён заходзіць у кабінет, здаецца, усё вакол напаўняецца нябачнай воку энергіяй, якая захапляе і натхняе. Такіх называюць яшчэ працаголікамі, бо, можаце не сумнявацца, пабудзі яго ноччу, ён адразу ж уключыцца ў работу. Калі спатрэбіцца, Ягор Турбал зможа кіраваць вытворчасцю — а ён кантралюе работу двух папераробчых машын — з любога, па сутнасці, месца планеты: у яго мабільніку ўстаноўлена адпаведная праграма. Працэс стварэння паперы бесперапынны, выхадных пры такой рабоце ў адказных людзей не бывае. Але малады чалавек не перажывае. Наадварот, кажа, што работа на заводзе — гэта тое, без чаго ён сябе не ўяўляе.

— Няўжо з дзяцінства марылі ствараць паперу? Можа, бацькі натхнілі?

— Не *(усміхаецца)*, ніхто з маіх сваякоў і сяброў не меў дачынення да таго, чым я цяпер займаюся. Маці, якой я вельмі ганаруся, працавала на кабельным заводзе, які ў савецкі час забяспечваў усю велізарную краіну адпаведнай прадукцыяй. Яна была вельмі актыўная і мабільная. Як і шмат хто з моладзі таго часу. Нарадзіўся я ў Находцы, горадзе на беразе Японскага мора, а вырас у Мазыры. Гэта горад майго дзяцінства. Падлеткам захапляўся спортам, ганяў у футбол, мы з аднагодкамі вялі актыўны лад жыцця, у адрозненне ад сучаснай моладзі. У школе больш любіў матэматыку, хімію і фізіку. Вучыўся ў тэхналагічным класе з ухілам на гэтыя прадметы. У Мазыры знаходзяцца буйныя нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы, куды ўсе хочуць працаўладкавацца, бо там высокія заробкі. Адзіны ўніверсітэт, які рыхтуе спецыялістаў для такіх заводаў, — Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт у Мінску. Туды паступіла шмат маіх сяброў, і я рыхтаваўся ў гэту ВНУ мэтанакіравана. Канкурэнцыя пры паступленні вельмі вялікая, асабліва на нафтаперапрацоўку, а ў мяне з мовамі было не ўсё так добра, як хацелася б. Сябры параілі паступаць на дрэваапрацоўку, маўляў, і факультэт цікавы, і прафесія. Я ж любіў хімію і матэматыку, а значыць мог пацягнуць гэтыя прадметы і ва ўніверсітэце.

— Наколькі ініцыятыўным былі падчас вучобы ў ВНУ?

— Наш універсітэт лічыцца адным са складаных. У некаторыя цяжка паступіць, але лёгка вучыцца, а ў нас наадварот. Я вучыўся на кафедры «Хімічная перапрацоўка драўніны» — адзіная кафедра, якая выпускае такіх спецыялістаў. З 60 чалавек, якія трапілі ў маю групу, да фінішу дайшлі толькі 40. Універсітэт «цяжкі», але вельмі цікавы. І вывучалі мы тое, што мне падабалася. У нас толькі хіміі было некалькі відаў — неарганічная, арганічная, хімія драўніны, аналітычная хімія, фізіка-хімічныя метады аналізу. І калі я быў «сярэднячок» па паспяховасці пры паступленні, то з кожным курсам у мяне атрымлівалася вучыцца ўсё лепш і лепш. І так склалася, што пры размеркаванні, якое ішло па балах, быў першы сярод хлопцаў. Апераджалі мяне толькі некалькі дзяўчат. Яны больш уседлівыя ў адрозненне ад хлопцаў. Я доўга не выбіраў, спыніўся на Шклоўскім заводзе газетнай паперы. І з дыпломам інжынера хіміка-тэхнолага прыйшоў сюды працаваць.

Працоўныя старты: пачатак

Завод газетнай паперы — унікальнае прадпрыемства, адзіны падобнага кшталту ў краіне. Дзякуючы абсталяванню вядучых еўрапейскіх вытворцаў і сучаснаму вытворчаму комплексу тут ствараюць паперу на любы густ. Яго прадукцыяй карыстаюцца больш чым 30 краін свету. Егіпет, напрыклад, заказвае ў Шклове таніраваную газетную паперу крэмавага і аранжавага колераў, на якой друкуюць свяшчэнны для мусульман Каран. А папераснова «Гегенцуг», якая таксама тут вырабляецца, выкарыстоўваецца пры вытворчасці ламінату для надання яму стабілізавальных уласцівасцяў. Не кажу ўжо пра модную сёння арыстакратычную белую мэблю, колер якой вызначае шклоўская папера-аснова для дэкаратыўных абліцовачных матэрыялаў.

— І ўсё ж такі, чаму менавіта Шклоў?

— За год да заканчэння ўніверсітэта я праходзіў тут тэхналагічную практыку і мне спадабалася. З заводам звязаныя і мае пераддыпломны і дыпломны праекты. Прадпрыемства тады вырабляла лёгкамелаваную паперу, і дэкан даў мне заданне падрыхтаваць альтэрнатыўны падбор рэцэптуры мелавальнай пасты. Неабходна было аптымізаваць наяўнасць у ёй дарагога латэксу, замяніць яго больш таннымі матэрыяламі, але не менш якаснымі. Сёння мы крыху адышлі ад мелаванай паперы, таму маімі даследаваннямі не скарысталіся. Але ў будучым плануем мадэрнізаваць мелавальную ўстаноўку.

Адным словам, на пятым курсе мы ўсе ўжо прыблізна ведалі, куды пойдзем працаваць. І хоць інжынерную практыку праходзіў на Салігорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце, мне больш падабаўся завод у Шклове. За ўвесь час работы на ім я ні разу не пашкадаваў аб сваім рашэнні. Тут заўсёды ёсць нейкая дынаміка ў дзейнасці, ні адна змена не падобная на папярэднюю, практычна не бывае аднолькавых праблем. Увесь час трэба развівацца, набываць новыя веды і ўменні. Мая пасада падказала, што я павінен валодаць не толькі тэхналогіямі і тэорыяй вытворчасці паперы, але і сумежнымі навыкамі. Каб ведаць, умоўна кажучы, што такое зазоры, цангавыя ўтулкі і гэтак далей. Разумець, як тое працуе і як за ўсім гэтым сачыць. Прыйшлося яшчэ раз пераглядзець свае адносіны да прадметаў, якія ва ўніверсітэце лічыў другараднымі, адносна нецікавымі. Калі нам чыталі лекцыю па той жа электратэхніцы, я не вельмі паглыбляўся ў прадмет, думаў, што дастаткова добра ведаць хімію. І толькі калі пайшоў працаваць, зразумеў, што нейкія моманты выпусціў з-пад увагі. Прыходзілася самастойна ўнікаць у нюансы і разбірацца. Наогул тэхнолаг — такая прафесія, што трэба ведаць шмат, быць універсальным спецыялістам. Слесар правярае біццё падшыпнікаў, спецыяліст кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі глядзіць за сваімі прыборамі, а тэхнолаг павінен усё гэта злучыць, каб ствараць якасную прадукцыю ў неабходным аб'ёме. Трэба ведаць усю структуру, увесь ланцужок. Я як аб'яднальнае звяно.

— Ці супалі вашы ўяўленні аб прафесіі з рэальнасцю?

— Пакуль не стаў працаваць, нічога не ўяўляў сабе пра яе. Была мэта працаваць, забяспечваць сябе. І толькі цяпер ацаніў, як добра, што ў нашых вышэйшых установах існуе размеркаванне. Калі б дзяржава мяне не падштурхнула, магчыма, пайшоў бы не туды. А так малады спецыяліст адчувае адказнасць, у яго ёсць стартавая пляцоўка. Наш завод 2008 года пабудовы і абсталяванне, якое я ўбачыў, калі прыйшоў сюды на практыку, было цалкам высокатэхналагічнае. Тут устаноўлена лінія вытворчасці тэрмамеханічнай масы аўстрыйскай кампаніі «Андрытц», якая з'яўляецца сусветным лідарам па вырабе такога абсталявання. Папераробчая машына была адной з самых перадавых, вырабляла газетную паперу з хуткасцю 850 метраў у хвіліну. Працаваць на такім прадпрыемстве было для мяне гонарам.

Чалавек на сваім месцы

Мне чамусьці здаецца, што Ягор Турбал змог бы сябе рэалізаваць дзе заўгодна. Ёсць у ім нешта такое, што не дазваляе яму «заржавець», — прага да новых ведаў, эксперыментаў, жаданне дабіцца станоўчага выніку. Такім людзям патрэбная поўная свабода дзеянняў, трамплін, каб разагнацца. Але калі спыталася, ці было жаданне «адкасіць» ад арміі, ён нават здзівіўся, маўляў, як так? Гэта ж грамадзянскі абавязак!

— Не сумавалі па сваёй вытворчасці, калі служылі?

— Там таксама было цікава *(усміхаецца)*. Гэта ж атрыманне новага вопыту — жыццё ў замкнутай сістэме, статутныя ўзаемаадносіны, строгія правілы, абавязкі. Я год адслужыў у 15-й ракетнай брыгадзе ў Фаніпалі. Наша воінская часць несла баявое дзяжурства па ахове паветранай прасторы Мінска з дапамогай ракетных комплексаў С-300. Служыў на камандным пункце планшэтыстам, павінен быў наносіць на карту цэлі ў люстраным адбітку. За год у мяне было 180 баявых дзяжурстваў. Мне давялося асвоіць новую прафесію і добра сябе зарэкамендаваць. Нават прапаноўвалі застацца, але мне на той момант было ўжо 25 гадоў, вельмі стары для лейтэнанта *(усміхаецца)*. І не вельмі хацеў нешта мяняць. Звольніўся з арміі, патэлефанаваў на вытворчасць. Было прыемна пачуць, што мяне чакаюць. Праз тыдзень пасля службы я ўжо выйшаў на работу.

Да кожнага — асаблівы падыход

На сцяне кабінета Ягора Турбала дзве красамоўныя карыкатуры на тэму вытворчасці паперы. Калісьці трапілі ў інтэрнэце на вочы і рассмяшылі. Ён іх раздрукаваў. Усміхаецца, што часам гэта натхняе на работу. Яна вельмі складаная, і важна перыядычна разгружацца. Жыццё не любіць, калі да яго заўсёды адносішся вельмі сур'ёзна. Можа і пакрыўдзіцца.

— Наколькі цяжка кіраваць вытворчасцю паперы і якія прад'яўляеце патрабаванні да калектыву?

— У вытворчасць уваходзяць два цэхі — газетнай паперы і паперы-асновы, у кожным стаіць па папераробчай машыне, на абслугоўванні якіх задзейнічана раўнамерная колькасць людзей. Усяго ў калектыве 152 чалавекі. Мая задача — арганізаваць работу цэхаў з захаваннем усіх неабходных нормаў. Глыбока перакананы, што да кожнага чалавека ёсць асаблівы падыход. З кімсьці трэба пагутарыць спакойна, абмеркаваць праблемы, сітуацыю і прычыны таго ці іншага выпадку. З іншым работнікам, магчыма, трэба быць больш строгім. Наогул, з любым чалавекам перш за ўсё трэба размаўляць. Калектыў наш прафесійны і дастаткова стабільны. Прыходзяць маладыя спецыялісты, нехта ідзе на пенсію.

Сярод маладых людзей ёсць вельмі амбіцыйныя, якія імкнуцца да новых ведаў, з такімі вельмі прыемна працаваць, хочацца ім дапамагчы, падказаць, зацікавіць.

— Кажуць, што чым больш чалавеку гадоў, тым ён больш вопытны...

— У нас сучасныя тэхналогіі, перадавое абсталяванне. Бывае, чалавек з вопытам, але яго веды ўжо ўстарэлі і сталі неактуальныя. Сёння кожны дзень нешта мяняецца. Маладому чалавеку прасцей растлумачыць, да яго хутчэй дойдзе інфармацыя. У нас тут амаль усё камп'ютарызавана, кіраванне вядзецца з пультаў. Малады чалавек хутчэй асвоіцца, чым больш сталы, які прывык працаваць уручную.

Я сам увесь час стараюся развівацца, наведваю разам з калегамі выставы, ездзім у камандзіроўкі, прыносім і ўкараняем на заводзе новыя тэхналогіі.

— Магчыма, што за час работы нейкія вашы рацпрапановы былі тут узятыя на ўзбраенне?

— Так. І неаднойчы. Некалькі гадоў таму па маёй ініцыятыве была мадэрнізаваная цэнтрабежная помпа. Неабходнасць была выкліканая тым, што тая перыядычна зрывалася і адбываўся брак на папераробчай машыне. Мы распрацавалі помпу іншага тыпу, асабіста займаўся вымярэннямі і падбіраў абсталяванне. У выніку той мадэрнізацыі знізіліся выдаткі электраэнергіі, а сама помпа працуе лепш і раўнамерна. Вынаходніцтва акупіла сябе на працягу месяца.

— Наколькі ваша вытворчасць адпавядае еўрапейскім стандартам?

— Наша папераробчая машына № 2 забяспечана ўсімі еўрапейскімі трэндамі ў плане тэхналогій. І на дадзены момант яна перадавая. Быў вопыт зносін з французскімі, нямецкімі, кітайскімі спецыялістамі, яны былі здзіўленыя, што ў нас такое высокатэхналагічнае абсталяванне. Мы ствараем адну з вельмі цяжкіх у вытворчасці папер — гэта аснова для дэкаратыўна-абліцовачных матэрыялаў. Санкцыі ствараюць пэўныя перашкоды, але мы шукаем альтэрнатыўных пастаўшчыкоў. Раней прадавалі газетную паперу на вялікай тэрыторыі, у тым ліку ў Еўропу. У сувязі з санкцыямі аб'ёмы зменшыліся, што прымусіла нас асвоіць новыя віды паперы. Лічу, што гэта дало штуршок у развіцці. Мы пачалі вытворчасць мяшочнай паперы, беленай, небеленай, паперы-асновы для слаістых пластыкаў. Пасля ўводу санкцый на пастаўку гэтай паперы ў Расію мы паспяшаліся заняць нішу. Пашырылі асартымент, а заадно павялічылі магутнасць і прадукцыйнасць.

У сувязі з санкцыямі прамысловасць Беларусі і Расійскай Федэрацыі павінна пачаць моцна развіцца. Пасля развалу Саюза справы ў прамысловасці былой вялікай краіны, якая на 100 працэнтаў магла забяспечыць сябе ўсімі матэрыяламі, рэсурсамі, кампанентамі, сталі пагаршацца. Нехта вырашыў, што не трэба ствараць нейкія там кампаненты, хімікаты, калі іх можна купіць у той жа Еўропе. Мы сталі набываць імпартныя камплектуючыя для адзення, ушчыльнікі, падшыпнікі, прэсавае сукно... Цяпер пачынаем вяртацца да лакалізацыі сваёй вытворчасці. У Амерыцы, дарэчы, тая ж сітуацыя. Яны разбурылі сваю прамысловасць шляхам пераносу магутнасцяў у Кітай. Сёння пачалі вяртаць яе зноў.

У трэндзе — мадэрнізацыя і развіццё

Суразмоўнік вельмі ганарыцца, што працуе на такім сучасным прадпрыемстве, і зацікаўлены, каб яно і надалей заставалася адным з першых. Таму адсочвае ўсе тэндэнцыі, звязаныя з вытворчасцю паперы. Сёлета ён у складзе дэлегацыі ад прадпрыемства пабываў у Кітаі. Прывёз шмат новых ідэй і планаў. Вунь нават кітайскую газету ў самалёце прыхапіў. Якасць паперы там вышэйшая. Але гэта, як той казаў, толькі стымул для пошукаў.

— Якія ўражанні ў вас ад краіны? Наколькі плённай была паездка?

— Нас з Кітаем аддзяляюць вялікія адлегласці і часавыя паясы, таму для больш цесных кантактаў мы вырашылі наведаць краіну. Матыў — працяг мадэрнізацыі першай папераробчай машыны, на якой вырабляецца газетная папера. Мы збіраемся яе перааснасціць для вырабу новых відаў паперы. Вярнуцца да той жа лёгкамелаванай, асновы для мелавання, марым арганізаваць вытворчасць чэкавай. Было цікава паглядзець на кітайскую прамысловасць і іх магчымасці. У нас там ёсць сябры — кампанія, з якой мы супрацоўнічаем з 2010 года, яны нас запрасілі, арганізавалі транзіт па гарадах. У нас толькі ўнутры Кітая было каля сямі пералётаў. Кожны дзень кудысьці ляцелі на самалёце, ехалі на цягніку, мянялі гасцініцы — вельмі выніковая атрымалася камандзіроўка. Мы паглядзелі кітайскае абсталяванне і ацанілі яго ў дзеянні. Сапраўды, кітайская прамысловасць магутная, мы бачылі, як растуць іх гарады, паўсюль ідзе будаўніцтва. Тэхналогіі ў іх пайшлі далёка наперад. У іх вельмі развітая інфраструктура.

— Што асабіста вы робіце для таго, каб ваша вытворчасць не адстала ад перадавых тэхналогій?

— Раз на два гады праходзіць вялікая выстава PulpFor у Санкт-Пецярбургу, дзе збіраюцца пастаўшчыкі абсталявання, паперы, у тым ліку і мы. Цікава пагутарыць з прафесіяналамі і сустрэцца з калегамі з іншых прадпрыемстваў, абмеркаваць сітуацыю, праблемы, шляхі іх вырашэння. Некалькі разоў наведваў семінары ў горадзе на Няве, быў на прадпрыемстве ў Курску, паспеў з'ездзіць у Фінляндыю. У горадзе Тамперы знаходзіцца вялікая кампанія ў галіне аўтаматызацыі. Быў у іх офісе, размаўляў з пастаўшчыкамі. Цяпер вось пабываў у Кітаі. Паднябесная стварае шмат абсталявання, мы паглядзелі, што яны прапануюць рынку. На дадзены момант вядзём перагаворы з кітайскімі кампаніямі аб мадэрнізацыі нашай папераробчай машыны і будаўніцтве новага ўчастка па нанясенні мелавальнага пакрыцця.

— Сёння ў моладзі шмат магчымасцяў рэалізаваць свае ідэі. Той жа рэспубліканскі праект «100 ідэй для Беларусі» — таму пацвярджэнне. Наколькі ініцыятыўныя людзі цікавыя для прадпрыемстваў?

— Маладыя жывуць у эпоху, калі ёсць доступ да любой інфармацыі. Але ідэя — яшчэ не ўсё. Трэба пралічыць, падабраць абсталяванне, а для гэтага патрэбныя час і веды. Аднойчы да мяне прыйшоў малады спецыяліст, прапанаваў ідэю, мы пагаварылі, аказалася, няправільнае было рашэнне. Ён прапаноўваў выкарыстоўваць чыстую ваду, каб больш эфектыўна працавала машына. Але высветлілася, што свежая вада мае больш нізкую тэмпературу, утвараецца кандэнсат, што дрэнна адбіваецца на папяровым палатне. Трэба выкарыстоўваць толькі падагрэтую ваду. У нейкім сэнсе ідэя добрая, але яе трэба дадумаць. Нельга нешта атрымаць хутка і адразу. За кожным дасягненнем стаіць упартая праца. Але толькі так можна ўдасканальвацца.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Аўдыяверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал «Центральный рынок».

Аукцион состоится 23.08.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - сеть энергоснабжения; - оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грундфос» УРС24*40, охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера-склад. Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов
Начальная цена продажи	2 008 662,40 р. (два миллиона восемь тысяч шестьсот шестьдесят два рубля сорок копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	200 866 р. (двести тысяч восемьсот шестьдесят шесть рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 21.08.2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.12.2022 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsionykopiya/	

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Бобруйский машиностроительный завод», 213805, г. Бобруйск, ул. К. Маркса, 235.
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов (одним лотом)
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, д. 235 /17-1, 235**

В состав лота входят: **помещение заводоуправления 1801,3 кв. м** (помещение, не относящееся к жилищному фонду, инв. номер 710/D-83597), **склад энергоцеха 187 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7257), **навес 287 кв. м** (сооружение неустановленного назначения, инв. номер 710/С-4265), **вентиляционная мастерская 158,3 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7254), **склад кислорода сжатого 85,2 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7509).

Сведения о земельном участке: пл. 6,0672 га, предоставлен продавцу на праве долевого постоянного пользования (доля: 164791/200000) для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. После продажи земельный участок будет разделен в долях, что составит **1,5117 га**

Начальная цена (с НДС 20 %) лота – 414 420,00 бел. руб. (снижена на 50 %)

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 30 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000** в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи: 7 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона 1,5 % от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.02.2023

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.08.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 15.08.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ЗАО «Ритейл Менеджмент ОС»** (УНП 693174745), объявляет о проведении **17.08.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Гончаровка, дер. Черниковщина, дер. Старина Заболотского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Вид аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	**06 сентября 2023 года, в 11.00, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1А, Заболотский сельисполком, кабинет председателя**
